# ДОЎГАЧАКАНАЯ НАВІНА

## З успамінаў Н. С. Хілюты, в. Леснявічы

- Калі пачалася вайна, мне толькі 12 год было, - успамінае Надзея Сямёнаўна Хілюта, якая жыве зараз ў Леснявічах. - Добра памятаю, як у нашай вёсцы, у Старынцах, з'явіліся немцы. Наша хата на самым узгорку стаяла. Па другі бок ад дарогі невялікі садок быў. Вось яго і аблюбавалі немцы для размяшчэння свайго штаба. Вядома, мы блізка туды ніколі не падыходзілі, а першыя часы ўвогуле баяліся нават з хаты выйсці. Памятаю, як аднаго хлопца, аднавяскоўца, амаль што не расстралялі з-за коратка падстрыжаных валасоў. «Зольдат, партызан - эршысэн!» - крычаў немец, наставіўшы на яго дула аўтамата. Але добра, што ў вёсцы быў чалавек, які трохі валодаў нямецкаю моваю і змог растлумачыць разгнева-наму фрыцу, што ў партызанах ён не быў, а ўвесь час знаходзіўся тут.



*Н. С. Хілюта.*

Гады акупацыі цягнуліся так марудна, што здавалася - гэтым цяжкім будням ніколі не будзе канца. Але нарэшце такі з'явіўся сонечны праменьчык на небасхіле. У ліпені 1944 годзе раён быў вызвалены ад захопнікаў, пакрысе пачалося аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі. Людзей не хапала - хто быў на фронце, хто вывезены ў Германію. Рабочыя рукі патрэбны былі ўсюды. Вось і я ў няпоўных шаснаццаць год уладкавалася на працу ў раённы вузел сувязі тэлефаністкай. Вучылася нядоўга, паказалі толькі, як уключыць тое ці іншае прыстасаванне, растлумачылі асноўныя мае абавязкі - і за працу. Работа была вельмі адказная, бо радыё, тэлеграф і тэлефон у той час з'яўляліся асноўнымі сродкамі інфармацыі і камунікацыі. Гэта цяпер націснуў некалькі кнопак на тэлефоне і размаўляй з кім хочаш. А ў той час злучэнне аднаго абанента з другім адбывалася толькі праз камутатар з дапамогай тэлефаністкі. Абанентамі тады былі найчасцей адказныя асобы,

кіраўнікі ррзных арганізацый і ўстаноў раёна, таму і адказнасць за работу ўзрастала ўдвайне.

Працавала я нядоўга тэлефаністкай, але затое на ўсё жыццё застаўся ў памяці той момант, калі абвясцілі аб безумоўнай капітуляцыі гітлераўскай Германіі і перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Я як раз дзяжурыла тады. Дзень быў вельмі прыгожы, сонечны. Побач са мной сядзелі хлопцы, тэлеграфісты. Яны атрымалі пэўную інфармацыю па тэлеграфе і падзяліліся сакрэтам, што па радыё будуць перадаваць нейкае вельмі важнае паведамленне. І, сапраўды, у хуткім часе людзі пачулі доўгачаканую навіну. Яна маланкай разносілася па ўсяму мястэчку. Што пасля гэтага рабілася на вуліцах Бераставіцы! Людзі абдымалі адзін аднаго, віншавалі з перамогай, хто плакаў, хто смяяўся. Зазванілі званы ў царкве. Адна жанчына ўзяла кавалак бляхі і моцна стукала па ім...

Немагчыма перадаць словамі ўсё тое, што тады адбывалася. Толькі відавочцы могуць узгадаць зноў і зноў тую незвычайную атмасферу, якая панавала паўсюдна.

Запісаў Сяргей Хілюта, в. Леснявічы,
2010 год.